Пролетарыі ўсіх краёў, злучайцеся!

# Савецкая Беларусь

Адрэс рэдакцыі і адміністрацыі:
Менск, Рог Губэрнатарскай і Падгорнай вул. Д. Сьвенціцкага, кв. 20.

ВЫДАНЬНЕ РЭУКОМУ СОЦЫЯЛІСТЫЧНАЙ САВЕЦКАЙ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСІ. № 67 (77). Аўторак, 23-га лістапада 1920 г.

## У чым наша пабеда?

Менскі пролетарыят сказаў сваё слова. Важкае і абдуманае. Ў поўным разуменьні важнасьці сваей пастановы, свайго галасаваньня.

Менскіе рабочые чутка адгукнуліся на прызыў да выбараў у Савет. Яны напоўнілі залі выбарных сходаў гучным зацікаўленым натаўпам.

Уважна чытаюцца інструкцыі выбараў, перачытваюцца і абгаварваюцца пункты наказу дэпутатам, запрапанованага комуністамі.

Пакуль прайшлі ўжо выбары ў профэсыянальных саюзах друкароў, будаўнічых рабочых, работнікаў сувязі, комунальных работнікаў.

І ўсюды эдзін і той самы выгляд. Усюды вялікае зацікаўленьне да выбараў, усюды гарачые спрэчкі, на тэму аб задачах Савету.

У спрэчках выяўляецца пазыцыя, занятая комуністамі, і спроба знайсьці і вызначыць свае пазыцыі са стараны Бунда і Поалей—Цыон.

І ў рэзультаце падчас бурных спрэчак рабочая маса ўсюды выбірае комуністаў і спачуваючых комуністам. Выбірае свабодна, выбірае аграмаднай большасьцю.

Дагэтуль не прайшлі віднейшые прадстаўнікі партыі Бунда, ня гледзячы на ўпартасьць іх агітацыі.

Дзеля чаго гэтак ёсьць? Чаму рабочая маса-наогул галодная і халодная ў цяжкіе дні разрухі, парою жалячаяся на Савецкую Ўладу і абвіняючая кіруючую комуністычную партыю ў тым, у чым яна найменш вінавата—ў разрусе, якая з'яўляецца рэзультатам чыста надворных стыхійных абставінаў,—чаму гэта маса дружна і аднадушна галасуе за сьпісак комуністаў?

А дзеля таго, што шчырай сваей працай комуністы даказалі, што яны запраўды здольны кіраваць краем.

А здольны яны ўпраўляць краем таму, што апіраюцца на сьвядомых рабочых, якіх уносяць у свае сьпіскі, ня лічачыся з іх партыйнасьцю.

І на прадвыбарных сходах менскіе рабочые пераканаліся на свае вочы, што няма нечагась асобнага паміж Савецкай Ўладай і рабочай масай, што Савецкая улада і рабочые—гэта адно і тое самае.

Вітаючы высокую сьвядомасьць менскага пролетарыяту, сказаўшага сваё магутнае рабочае слова, мы чакаем, што і далейшы працяг выбараў дасьць добрые скуткі нашай пролетарскай сьвядомасьці, моцы, гатоўнасьці далей вясьці нашу сацыяльную барацьбу ў надзеі на пэўную пабеду комунізма на ўсім сьвеце.

**В. Ахрамовіч.**

## Абарона Савецкіх Рэспублік.

*Весткі з фронту за 19 лістапада.*

### Заходні фронт.

У Мазырскай ваколіцы наша наступленьне ўсьпешна разьвіваецца, прычым намі занята мястэчка Калінкавічы; захоплены палонные і іншые здабычы.

У Рэчыцкім районе наступленьне праціўніка на Рэчыцу намі адбіта. Праціўнік адыходзіць у паўдзённа-заходнім кірунку.

### Паўдзённа-заходні фронт.

У кірунку Карасьцень—Мазыр нашы часьці занялі ст. „Славачну“ і пераправіліся праз рэчку Славачну.

Паўночна-заходней Оўруча наша наступленьне вядзецца далей.

У Праскураўскім кірунку ў районе Дзяражні вядзецца бой. Заходней нашы часьці, разьбіўшы зноў праціўніка, занялі рад пунктаў у 12—25 вярстох паўдзённа-ўсходней і паўдзёньней Праскурава, прычым наша коньніца і пяхота, па дапаўніцельных вестках, уварвалася ў горад Праскураў, дзе вядзецца цяпер бой.

У бойках паўдзённа-ўсходней Праскурава намі часткай разьбіты, часткай узяты ў палон 1-ы Каўкаскі кавалярыйскі полк праціўніка.

### Паўдзённы фронт.

У Керчынскім кірунку, па дапаўніцельных вестках, у гор. Керчы захоплена 13.000 палонных, больш 9.000 стравых коняў, бранявы дзівізіон з абслугаю ў складзе 15 бранямашын, 14 грузавых і 18 лёгкіх самаходаў і шмат гарматкулямётаў. У гавані захоплена 4 параходы праціўніка.

*Ваенком Палявога Штабу* **Данішэўскі.**

*Весткі з фронту за 20 лістапада.*

### Заходні фронт.

**У Мазырскім районе** нашые часьці фарсіравалі **Прыпяць** і вядуць бітвы за Мазыр.

**У Рэчыцкім районе** нашые часьці адбіўшы наступ цясьняць праціўніка на **Прыпяць.** У бітвах ад 10 па 18 узята 1400 палонных балахоўцаў, 40 афіцэраў, 32 кулямёты, 2 гарматы, шмат стрэльбаў, абозу.

**У Кірунку Карасьцень—Мазыр** адбываюцца бітвы з пераменным усьпехам.

### Паўдзённы фронт.

**У Крыме спакойна.** Ідзе далей рэгістрацыя палонных, падлік здабыткаў.

*Ваенком Палявога Штабу* **Данішэўскі.**

## За мір з Расеяй.

„Савет чыннасьці“ выпусьціў маніхвэст да правінцыяльных саветаў і рабочых саюзаў, у якім гаворыцца, што ангельскім рабочым патрэбны ня толькі гандаль з Расеяй, але поўны мір з ёю. Маніхвэст прадпісвае ўсім мясцовым „Саветам чыннасьці“ наладжываць па ўсім краю спэцыяльные мітынгі дзеля прапаганды поўнага міру з Расеяй.

